**КЛЫШКА** Анатоль Канстанцінавіч [нар. 16.04.1935 г., в. Данейкі Баранвіцкага р-на Брэсцкай вобл.], літаратуразнавец, крытык, педагог.

Пасля заканчэння Заполле-Ятранскай сямігадовай школы ў 1949–1952 гг. працягваў вучобу ў Навагрудскім педвучылішчы. З 1952 г. працаваў карэктарам у Навагрудскай гарадской газеце. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1958). З 1957 г. пачаў супрацоўнічаць у аддзеле літаратуры газеты ” Літаратура і мастацтва“, у 1958 г. працаваў інструктарам па друку ў аддзеле прапаганды і агітацыі ЦК ЛКСМ Беларусі. З 1959 г. – літработнік аддзела крытыкі, а пазней – рэдактар аддзела навукі і мастацтва ў рэдакцыі часопіса ”Полымя“. Узначальваў аддзел методыкі навучання літаратуры Навукова-даследчага інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР (1971–1980). У 1981–1983 гг. – загадчык рэдакцыі выдавецтва ”Юнацтва“, у 1986–1990 гг. – загадчык аддзела крытыкі часопіса ”Полымя “.

А. К. Клышка выступае ў друку з 1953 г. Побач з літаратурна-крытычнай працай прымае актыўны ўдзел у навукова-метадычным забеспячэнні навучальнага працэсу ў агульнаадукацыйных школах: ім падрыхтаваны і выдадзены падручнікі і вучэбныя дапаможнікі па навучанні грамаце ў 1 класе, выдадзены кнігі для дадатковага і пазакласнага чытання ў 1 і 2 ступенях навучання, распрацоўваліся пытанні методыкі навучання беларускай літаратуры. ”Буквар“ А.К. Клышкі, адзначаны ў 1968 г. прэміяй на рэспубліканскім конкурсе, вытрымаў болей за 30 выданняў. У 1970–80-х гг. А.К. Клышка выдаў кнігі і вучэбныя дапаможнікі для дзяцей: ”У лясах Белавежы“ (1975), ”Самая лепшая хатка“ (1976), ”Верасок“ (1978), ”Вярэнька загадак: адкажы, чаму загадкі маюць гэткія адгадкі“ (1982), ” Пропісі: вучэбны дапаможнік для першага класа“ (1986), ”Францыск Скарына, альбо як да нас прыйшла кніга“ (1983), ”Чабарок: чытанка для 4 класа з рускай мовай навучання“ (1989).

Узнагароджаны медалём Францішка Скарыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ